

# БАБУЛІН ЗАПЛЫЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й старонцы.)*

Час мае сваю памяць — гісторыю. І дапамагае захоўваць гэтую гісторыю не што іншае, як фатаграфія. Падзея, пра якую я хачу расказаць, ужо стала гісторыяй, але здымкі нагадваюць мне пра яе і вяртаюць у незабыўную атмасферу спартыўнага азарту.

Гэтай зімой давялося фатаграфаваць незвычайныя спаборніцтвы — плаванне ў ледзяной вадзе. Гэта быў этап Кубка свету па зімовым плаванні, які першы раз праходзіў у Мінску. У тыя дні якраз стаяла марознае надвор'е, на градусніку было 10 градусаў са знакам мінус. Але ні іней на дрэвах, ні пара, якая ішла ад вады, не бянтэжылі ўдзельнікаў у адных плаўках і купальніках.

Мне трэба было перадаць атмасферу спартыўнага свята. Здзівіла тое, што разам з маладымі мужчынамі-плыўцамі былі і прадстаўніцы прыгожай паловы. Больш за тое, на стартавую дарожку выходзілі... бабулі. Некаторым з іх было далёка за 60! Многія з іх прыехалі ў беларускую сталіцу з Расіі, Украіны, Латвіі, Эстоніі і іншых краін, каб паказаць сваю сапраўдную загартоўку. З якім пазітыўным настроем бабулі-«маржы» ішлі на свой чарговы заплыў і давалі нырца ў ледзяную ваду! Суддзі, гледачы і мы — журналісты, фатографы і тэлевізійнікі, — захутаўшыся ў цёплыя курткі і надзеўшы пальчаткі, са шчырым здзіўленнем паглядалі на амбіцыйных, адважных і гордых прыгажунь.







З размовы з 72-гадовай Рымай Васяльчук *(яе фота на першай старонцы)* я даведалася, што плыўчыха прыехала з расійскага Арла па чарговую ўзнагароду, на яе рахунку ўжо 130 медалёў. І самае галоўнае, што я пачула, — дзякуючы маржаванню гераіня даўно забылася пра свае хваробы.

Не хаваючы эмоцый, я мімаволі пазайздросціла гэтым жанчынам-экстрэмалкам. З якім настроем ставяцца яны да свайго «халоднага» захаплення! Паглядзеўшы на гэтыя здымкі, нехта захоча змяніць жыццё і паспрабаваць сябе ў такой незвычайнай ролі. А чаму б і не?!

**Ганна ЗАНКАВІЧ,**
**фота аўтара.**